# Вытокі беларускага этнасу





**Іван Саверчанка,**
дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, доктар філалагічных навук, прафесар

Першыя людзі на Беларусі з'явіліся каля 300 тыс. гадоў назад, у эпоху палеаліту, які пачаўся 2,6 млн гадоў назад і доўжыўся да X тысячагоддзя да н.э. Аб пракаветным засяленні рэгіёна чалавекам разумным (*Homo sapiens*) сведчыць калекцыя старадаўніх каменных прылад працы, выяўленых паблізу вёскі Агова (Іванаўскі раён).

Яшчэ адно даўняе паселішча людзей – гэтым разам тых, што жылі на беларускай зямлі каля 40 тыс. гадоў таму – адшукана непадалёк ад Навасёлак у Веткаўскім раёне Гомельскай вобласці.

Старажытная стаянка ў Юравічах (Калінкавіцкі раён) мае ўзрост каля 26 тыс. гадоў, а паблізу вёскі Бердыж (Чачэрскі раён) – каля 24 тыс. гадоў. Асобныя крамянёвыя прылады працы каменнага веку знойдзены каля вёсак Свяцілавічы Веткаўскага і Абідавічы Быхаўскага раёнаў.

У даўнія часы насельнікі Беларусі займаліся пераважна збіральніцтвам, паляваннем на дзікіх звяроў і птушак, а таксама лоўляй рыбы. Яны карысталіся прымітыўнымі прыладамі працы – палкамі і камянямі.

Значны прагрэс адбыўся ў той момант, калі чалавек прызвычаіўся выкарыстоўваць агонь для абагрэву і прыгатавання ежы. Паступова людзі прыручылі сабак і вынайшлі лук са стрэламі, навучыліся ўзводзіць простае жытло і рабіць першыя транспартныя сродкі – плыты і лодкі-даўблёнкі.

Прадстаўнікі *Homo sapiens* мелі маўленчыя здольнасці. Дзеля камунікацыі і арганізацыі калектыўных дзеянняў разам з выкарыстаннем жэстаў яны прамаўлялі гукі і словы, за якімі замацоўваліся пэўныя сэнсы. Прыкладна 100 тыс. год назад узнікла мова, якая паступова эвалюцыянавала і развівалася.

Сучасны чалавек з уласцівымі яму рысамі і паводзінамі сфармаваўся на заключнай стадыі эпохі палеаліту, прыкладна 13 тыс. год назад. Людзі адрозніваліся свядомасцю, інтэлектуальнымі і пазнавальнымі здольнасцямі. Схільнасць да кагнітыўнай дзейнасці, выкарыстанне мовы і сацыяльнае ўзаемадзеянне дазволілі чалавеку разумнаму не толькі выжыць у складаных і зменлівых умовах, але і значна пашырыць арэол рассялення.

Людзі, што належалі да віда *Homo sapiens*, валодалі творчым уяўленнем і фантазіяй, дзякуючы чаму ў іх зарадзілася міфалогія, а з часам пачалі фарміравацца аб'ектыўныя веды пра саміх сябе і прыроду. З'явіліся музыка і скокі, якія выконваліся, як правіла, падчас святаў, магічных рытуалаў і абрадаў.

## Цывілізацыйная прыналежнасць

З X тысячагоддзя да н.э., у эпоху мезаліту, якая пачалася пасля істотнага пацяплення і ўсталявання спрыяльных кліматычных умоў, назіраецца сталае засяленне тэрыторыі сучаснай Беларусі. Аб узроўні цывілізацыйнага развіцця і стану тагачаснай матэрыяльнай культуры сведчаць шматлікія археалагічныя знаходкі. У нашай краіне адкрыта каля 120 стаянак таго часу. Буйны археалагічны помнік знаходзіцца ў вёсцы Дзедні Чавускага раёна Магілёўскай вобласці.

Гэтаксама ў вёсцы Крумплева на правым беразе Заходняй Дзвіны, за 30 км ніжэй ад Полацка, знойдзена мезалітычная стаянка. Непадалёк ад яе, на левым беразе каля вёскі Пятроўшчына, знаходзілася яшчэ адно месца пасялення старажытнага чалавека той эпохі.

Беларускія землі асвойвалі пераважна індаеўрапейцы – прадстаўнікі буйной супольнасці, аб'яднанай агульнай мовай, прарадзімай якіх лічыцца тэрыторыя Паўночнага Прычарнамор'я – вялізная прастора паміж Дняпром і Волгай. Пасля прыручэння коней індаеўрапейцы атрымалі магчымасць актыўна рассяляцца ў розных напрамках,

што радыкальна змяніла іх жыццёвы ўклад і дазволіла заняць лідарскія пазіцыі. Рознакірункавая міграцыя суправаджалася асіміляцыяй мясцовага насельніцтва і ўзнікненнем дыялектаў, на аснове якіх з часам сфармаваліся вялікія моўныя групы, а пасля і асобныя мовы.

Індаеўрапейская моўная сям'я атрымала вельмі шырокае разгалінаванне: яна ўключае 10 моўных груп, сярод якіх індаарыйская (індыйская), германская, раманская, балцкая, славянская, кельцкая, індаіранская, грэчаская. Асобнымі мовамі сфарміраваліся армянская і албанская, пры гэтым агульная колькасць індаеўрапейскіх каранёў у іх налічвае некалькі сот адзінак.

У глыбокай старажытнасці індаеўрапейцы належалі да адзінай супольнасці народаў. Філалагічным маркерам на карысць праўдзівасці гэтага меркавання з'яўляецца наяўнасць ва ўсіх індаеўрапейскіх мовах чаргавання гукаў к і ч (беларускае пяку – пячэш). Гэтая фанетычная ўніверсалія назіраецца ў фіна-ўгорскіх і семіцкіх мовах, што дазваляе гаварыць пра супольныя вытокі старажытных цывілізацый.

У часы індаеўрапейскага цывілізацыйнага адзінства на тэрыторыі сучаснай Беларусі ўзніклі і замацаваліся многія з мікратапонімаў, гідронімаў і айконімаў, якія ў найменшай ступені паддаюцца зменам. Наяўнасць у сучасных балцкіх мовах блізкіх да гэтых назваў сэнсаў сведчыць хутчэй пра агульныя з беларусамі этнакультурныя вытокі славянскіх і балцкіх народаў, а не пра сталае засяленне балтамі тэрыторыі сучаснай Беларусі ў мінулым, як часам памылкова лічыцца.

Не выключана, што ў эпоху мезаліту на тэрыторыю заходняй Беларусі паміж Нёманам і Дзвіной з паўночнага ўсходу зайшла невялікая група фіна-ўграў. Яны карысталіся вырабамі з рога і косці, а таксама ўжывалі адметную грабенчата-ямкавую кераміку, узоры якой знойдзены каля Пастаў і ў Паазер'і.

У якасці ўпрыгажэнняў прышэльцы выкарыстоўвалі бурштынавыя вырабы – падвескі, кольцы, трубачкі і гузікі. Наяўнасць у беларускай мове фіна-ўгорскіх элементаў з'яўляецца сведчаннем іх прысутнасці на беларускіх землях ці, прынамсі, заўважнага культурнага ўзаемадзеяння з далёкімі продкамі беларусаў.

Як сведчаць вынікі археалагічных прац, у перыяд мезаліту людзі аддавалі перавагу аседламу ладу жыцця, узводзілі трывалае жыллё. У іх з'явіліся навыкі вытворчасці прадметаў адзення і пляцення кошыкаў з лазы і трыснягу. З маладога арэшніку выраблялі прылады для лоўлі рыбы, са сталоў дрэў рыхтавалі пасткі для дзікіх жывёл.

З пацяпленнем у беларускіх лясах размножыліся новыя віды фаўны: алень, лось, зубр, буры мядзведзь, кабан, бабёр. Далёкія продкі беларусаў умела здабывалі іх падчас паляванняў і ловаў. Майстэрства палявання на дзікіх жывёл і птушак было даведзена да дасканаласці.

У час неаліту, які пачаўся з канца V тысячагоддзя да н.э., людзі навучыліся вырабляць кераміку і прылады працы з крэменю. На беларускай зямлі расквітнела культура шарападобных амфар. З'явіліся першыя ўзоры ткацтва. У Падняпроўі, Панямонні, Падзвінні і ўздож Прыпяці выяўлена каля тысячы неалітычных стаянак. Найбольш вядомы на сёння помнік перыяду неаліту – шахта па здабычы крэменю каля пасёлка Краснасельскі Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці.

У эпоху неаліту адбыліся значныя сацыяльна-грамадскія зрухі. З пачаткам выкарыстання бронзы (каля 3200 г. да н.э.), якую выраблялі са сплаваў медзі і волава на Паўночным Каўказе і ў Балкана-Карпацкім рэгіёне, прадоўжыўся працэс актыўнай міграцыі індаеўрапейцаў у розных напрамках. Менавіта наватарскія тэхналогіі вырабу бронзавых мячоў і вынаходніцтва калясніцы забяспечылі іх істотнымі перавагамі перад іншымі народамі Еўропы і Азіі, дазволілі дамінаваць у шэрагу рэгіёнаў.

Найбольш каштоўная пісьмовая крыніца ўсходніх індаеўрапейцаў – «Рыгведа», створаная ў сярэдзіне II тысячагоддзя да н.э. У ёй знайшлі адлюстраванне ўяўленні старажытных людзей аб навакольным свеце, багах і рытуалах, сацыяльным упарадкаванні і космасе, а таксама этыцы і маральных нормах.

Пачалося насычанае сацыяльнае і духоўнае жыццё. Людзі жылі сем'ямі і аб'ядноўваліся ў вялікія супольнасці, што дазваляла ім хутчэй развівацца і лягчэй вырашаць наспелыя праблемы. Удасканальвалася вусная мова, якая дапамагала актыўна камунікаваць, захоўваць назапашаныя веды і перадаваць набыты досвед наступным пакаленням.

Да індаеўрапейскай моўнай праасновы далёкія продкі беларусаў смела дадавалі новыя тэрміны, якія абазначалі дзеянні і прадметы, а таксама іх характэрныя рысы і ўласцівасці. У сучаснай беларускай мове захаваліся і актыўна выкарыстоўваюцца шматлікія назоўнікі, прыметнікі і дзеясловы, якія маюць індаеўрапейскія карані, як напрыклад: брат, сястра, белы, гусь, браць, булькаць, блішчэць, доўгі, пчала, маці, нос, сын, сонца, два, ноч, снег, тры, звер, звон. Менавіта яны з'яўляюцца галоўным індыкатарам прыналежнасці беларусаў да індаеўрапейскай цывілізацыі.

Адбылося заўважнае інтэлектуальнае развіццё людзей, істотна пашырыліся веды пра рэчаіснасць, узбагаціўся жыццёвы досвед. Назіралася значная эвалюцыя свядомасці: у людзей зарадзіліся ўяўленні пра навакольны свет і саміх сябе, пра паходжанне рэк і азёр, крыніц і балот. Духоўна апантаныя асобы пачалі тлумачыць з'яўленне вялізных валуноў і пагоркаў, нябёсаў і падземнага свету. Паколькі існаванне і жыццё чалавека наўпрост залежала ад вады, агню, зямлі і паветра, яны абагаўлялі іх, напаўнялі сакральным сэнсам і, урэшце, здзяйснялі рытуальныя дзеянні дзеля іх ушанавання.

Уражаныя нябёсамі, далёкія прашчуры пакланяліся і шчыра маліліся сонцу і месяцу, зоркам і сузор'ям. Сонца ўяўлялася ім вялікім колам, якое коціцца па небе і дае жыццё ўсяму жывому на Зямлі. Месяц уплываў на ураджай і прыплод. Зоркі і сузор'і, паводле архаічных уяўленняў, прадвызначалі лёс чалавека, моцна ўздзейнічалі на адносіны паміж людзьмі і народамі.

У пракаветныя часы сфармаваліся вераванні ў звышсілы і табу – забароны на пэўныя дзеянні. Узніклі першыя ўзоры вуснай народнай творчасці, замовы і песні, міфы і паданні, развіваліся музыка і скокі, пашыраліся магічныя абрады і таемныя рытуалы.

Неабмежаваная мастацкая фантазія людзей нараджала каларытныя вобразы і яркія сюжэты. Варожыя сілы і небяспечныя з'явы прыроды ўвасобіліся ў персанажы Цмока і змеегаловых істотаў, якія імкнуліся нашкодзіць людзям, нанесці ім урон. Былі створаны тыпажы герояў – дужых асілкаў, мужных абаронцаў людзей, якія выручалі іх з бяды, дапамагалі пераадолець цяжкасці.

## Прарадзіма славян

Працэс фарміравання славянскага ядра пачаўся на тэрыторыі сучаснага Беларускага Палесся прыкладна ў II тысячагоддзі да н.э. У гэты час адбылося вылучэнне славян з адзінай балта-славянскай моўнай галіны ў асобную этнічную групу. Паступова сфарміравалася праславянская мова, на грунце якой пачынаючы прыкладна з I ст.н.э. пачалі складвацца паўднёваславянскія, заходнеславянскія і ўсходнеславянскія мовы.

Найбольш раннія пісьмовыя звесткі пра славян падае старажытнагрэчаскі гісторык і географ Герадот (каля 484–425 гг. да н.э.), аўтар знакамітай «Гісторыі». Ён называе жыхароў сучасных Беларусі і Украіны «неўрамі» і «скіфамі-земляробамі». Герадот упэўнена сцвярджаў, што яны жылі ў басейне Барысфена (Дняпра), ужывалі хлеб, цыбулю, часнок і проса.

Славутыя рымскія вучоныя Пліній Старэйшы (каля 22–79 гг. н.э.) і Карнелій Тацыт (каля 55–120 гг.н.э.) у сваіх творах называлі славян венедамі. Іх сціслыя характарыстыкі сведчаць аб тым, што славяне ўжо ў I ст. з'яўляліся асобнай цывілізацыйнай і этнічнай супольнасцю.

Пісьмовыя сведчанні Герадота, Плінія Старэйшага і Карнелія Тацыта з'яўляюцца фармальнай прыкметай адліку этнічнай і сацыяльнай гісторыі славянскіх народаў.

На шырокую гістарычную арэну славянскія народы найбольш актыўна пачалі выходзіць у VI ст. З гэтага часу яны ўсё часцей фігуруюць у шматлікіх пісьмовых крыніцах.

Гоцкі гісторык VI ст. Іардан у сваёй працы «Аб паходжанні і дзяяннях гетаў», датаванай 551 г., часта згадваў усходніх славян. Ён называў іх «склавенамі», «венетамі» і «антамі», адзначаючы іх этнічную блізкасць і агульныя карані. Іардан паведаміў пра правадыра антаў Божа і яго сыноў, што загінулі разам з 70 старэйшынамі падчас бітвы з готамі, якімі кіраваў Вінітарый.

Візантыйскія і арабскія вандроўнікі і гісторыкі з VI ст. таксама дастаткова многа паведамлялі аб звычаях і норавах славян. Так, пра іх шырока і грунтоўна пісалі такія старажытныя аўтары, як Пракоп Кесарыйскі, Менандр Пратэктар, Іаан Эфескі, Маўрыкій, Феафілакт Сімаката, Феафан, Нікіфар і Міхаіл Сірыец. Даўнія пісьмовыя крыніцы ўтрымліваюць звесткі пра ўдзел славянскіх атрадаў у паходзе імператара Юстыніяна II супраць арабаў у 692 г. Дакладна вядома, што ўжо з VII ст. асобныя славянскія народы мелі протадзяржаўныя ўтварэнні.

Унікальныя звесткі аб палітычным і сацыяльным жыцці славян захаваліся ў германскіх лацінамоўных хроніках. З X ст. дайшла «Хроніка» Цітмара Мерзебургскага, у якой расказваецца пра германаславянскія дачыненні. Важнай пісьмовай крыніцай па гісторыі славян з'яўляецца твор Адама Брэменскага «Дзяянні архіепіскапаў Гамбургскай царквы», які быў створаны ў XI ст. Аўтар паведамляе пра ўплывовыя заходнеславянскія дзяржавы, дэталёва апісвае язычніцкае свяцілішча славянскага бога Сварога.

Археалагічныя знаходкі сведчаць аб тым, што славяне вельмі рана асвоілі складаныя тэхналогіі выплаўкі і апрацоўкі жалеза. Яны навучыліся вырабляць з яго прылады працы і зброю, што забяспечыла іх сацыяльнае першынства і дало

значныя перавагі перад іншымі этнічнымі супольнасцямі.

Менавіта на Беларусі існавала шмат даступных радовішчаў балотнай руды, з якой майстры-металургі пры высокіх тэмпературах выплаўлялі жалеза. Да нашага часу захаваліся дзясяткі старадаўніх мястэчак з назвай Рудня, якія красамоўна сведчыць пра тое, што ў даўнія часы там знаходзіліся месцы здабычы сыравіны і вытворчасці жалеза. Дзякуючы тэхналагічнаму лідарству кемлівыя славяне з часам занялі велізарныя абшары Еўрапейскай раўніны і Дунайскія нізіны.

У выніку паспяховага вядзення гаспадаркі і спрыяльных абставін славяне шчытна засялілі Усходнюю Еўропу і Балканскі паўвостраў. На працягу наступных стагоддзяў назіралася імклівае развіццё і пашырэнне славянскай цывілізацыі, яна хутка сталела і разгаліноўвалася.

Славяне абжыліся ўздоўж паўнаводных рэк і бруістых рачулак, каля жыццядайных азёр і крыніц. Яны паспяхова рассяліліся ў басейнах буйных еўрапейскіх рэк – Эльбы, Одры і Віслы. Славянскія плямёны аселі па берагах Днястра і Паўднёвага Буга, вакол возера Ільмень і ў вярхоўі Волгі. Многія славянскія народы, як, напрыклад, люцічы, бодрычы, вільцы, паморы і руяне, абжылі ўзбярэжжа Балтыйскага мора.

Тэрыторыя рассялення славян супадае з арэолам распаўсюджання культуры штрыхаванай керамікі. Яна пачалася з канца III тысячагоддзя да н.э. і атрымала сваю назву ад арнаменту на гліняным посудзе, яркія ўзоры якога адшуканы на археалагічных помніках Моталя, Уладычына, Вострава, Цярэбіна. Сярод прылад працы знойдзены шліфаваныя крамянёвыя сякеры-кліны, сярпы і матыкі.

Да ліку ўласна славянскіх і протабеларускіх археалагічных культур належыць шэраг стаянак банцараўскай, мілаградскай, калочынскай і пражскай культур, а таксама некаторыя паселішчы культуры доўгіх курганоў (VIII–X стст.). Падчас раскопак у іх знойдзены жалезныя прылады працы: сякеры і сярпы, нажы і наканечнікі дзідаў.

Галоўным помнікам банцараўскай культуры з’яўляецца гарадзішча Банцараўшчына, размешчанае на левым беразе ракі Свіслачы. Ніжні культурны слой гарадка датуецца III ст. да н.э., што даказвае яго існаванне ўжо ў антычныя часы. На гэтым месцы знойдзены рэшткі кос, сярпоў і нажоў, а таксама розныя ляпныя вырабы з гліны. Банцараўшчына з даўніх часоў служыла кропкай пераваλу тавараў на гандлёвым калідоры з Віліі і Ушы ў Свіслач, якія затым траплялі ў Бярэзіну і Дняпро. Перавал, або перакуль, тавараў з воднага басейна Нёмана ў басейн Дняпра прыносіў добрыя прыбыткі жыхарам гарадка, а таксама з’яўляўся важнай крыніцай яго росквіту.

Мілаградская культура існавала ў VII–I стст. да н.э. Яна названа паводле эталоннага паселішча Мілаград, што знаходзіцца ў Рэчыцкім раёне Гомельскай вобласці. У пахавальных абрадах мілаградцаў пераважала крэмацыя. Яны займаліся жывёлагадоўляй і практыкавалі падсечнае земляробства.

Помнікі калочынскай культуры адшуканы ў ніжнім цячэнні Бярэзіны і ля вусця Пцічы. Назва культуры паходзіць ад эталоннага паселішча, якое знаходзілася каля вёскі Калочын Рэчыцкага раёна. Калочынская культура існавала ў IV–VII стст. Яна таксама мела распаўсюджанне ў басейне ракі Дзясны.

Найбольш старажытныя помнікі пражскай культуры (V–VII стст.) адшуканы на Палессі, каля вёсак Хорск і Хотамель, якія знаходзяцца на рацэ Гарыні. Прадстаўнікі гэтай культуры займаліся земляробствам і жывёлагадоўляй. Сярод збожжавых культур, якія яны вырошчвалі, пераважалі пшаніца, авёс і ячмень. Гадавалі буйную рагатую жывёлу, а таксама свіней, авечак і курэй.

Як бачна, зусім не выпадкова рэгіён Беларускага Палесся лічыцца прарадзімай, калыскай славянскіх народаў. Ён з’яўляецца тым прыдатным месцам, дзе ў далёкія часы ўзнікла і расквітнела славянская цывілізацыя. З Беларускага Палесся пачалося інтэнсіўнае рассяленне славян, хуткае асваенне імі вялікіх абшараў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Славянскія народы імкліва асвойвалі свабодныя землі, уладкоўвалі і абжывалі іх. У асобных кутках адбывалася славянізацыя кельтаў, балтаў і фіна-уграў. Славяне выразна ўсведамлялі сваю этнічную тоеснасць і духоўна-культурнае адзінства, што знайшло адлюстраванне ў мове, шматлікіх помніках агульнаславянскай гісторыі і культуры.

Славянская моўная група ўключае тры вялікія падгрупы: усходнеславянскую (беларуская, руская, украінская); заходнеславянскую (польская, кашубская, чэшская, славацкая, палабская (мёртвая), верхня- і ніжнялужыцкая) і паўднёваславянскую (балгарская, македонская, сербская, харвацкая, славенская, старaславянская (мёртвая) мовы).

У духоўна-культурным жыцці продкаў беларусаў адбыліся істотныя змены. Сфармавалася праславянская мова, якая кансалідавала ўсіх славян і ўплывала на іх менталітэт. У беларускай мове актыўна функцыянуюць каля дзвюх тысяч слоў, якія маюць агульнаславянскае паходжанне, напрыклад: галава, вока, вуха, рука, нага, нос, рот, зуб, вялікі, малы, добры, дрэнны, новы, стары, ісці, ляжаць, сядзець,

бачыць, чуць, поле, неба, зямля, рака, вецер, дождж, клён, ліпа, лось, змяя, камар, муха, сын, дачка, маці, бацька, дом, вада, піць, спаць, бачыць, чуць. Акурат яны сведчаць аб тым, што беларускую мову можна лічыць протамовай славянскіх народаў, у якой найбольш поўна захаваліся архаічныя лексічныя пласты.

У часы агульнаславянскага адзінства ўзніклі і пашырыліся яркія шэдэўры фальклору, былі створаны новыя замовы і песні, чарадзейныя казкі і казкі пра жывёл, міфы, легенды і паданні. З'явіліся музычныя інструменты – гуслі і дудкі. У творах узніклі тэмы Маці-Зямлі і роднага краю, вобраз каня з крыламі.

Аформіліся маляўнічыя вясельныя абрады, а таксама захапляльныя рытуалы, звязаныя з земляробчым календаром. Замацаваліся пахавальныя звычаі і традыцыі развітання з нябожчыкамі.

Людзі нязменна імкнуліся вытлумачваць з'явы навакольнага свету, паходжанне і ўласцівасці шматлікіх прадметаў і рэчаў. Продкі беларусаў спрабавалі адказаць на складаныя пытанні: чаму дзень змяняецца на ноч, святло на цемру, з якой прычыны адбываюцца змены пораў года. Гэтыя адказы нярэдка мелі фантастычную афарбоўку і дзівосныя тлумачэнні.

Зарадзіўся рэфлексіўны тып мыслення, неспатольная прага людзей даведацца пра ўласнае паходжанне і высветліць прызначэнне чалавека на Зямлі. Узніклі ўяўленні пра беднасць і багацце, законы і права. Сфарміравалася этыка і мадэль сацыяльных паводзін. У грамадстве культывавалася паважлівае стаўленне да дарослых і бацькоў, віталіся ўзаемадапамога і талакоўства. Ухваляліся гасціннасць і сяброўства, працавітасць і сумленнасць, шанаванне блізкіх і суседзяў.

## Пачатак этнічнай гісторыі

Продкі сучасных беларусаў спрадвеку жылі ў басейнах буйных рэк: Дняпра і Прыпяці, Дзвіны і Нёмана, Бярэзіны і Друці, Дзясны і Сожа, Віліі і Улы, Проні і Віхры. Яны таксама ахвотна займалі тэрыторыі вакол празрыстых азёр – Нарачы, Свіры, Дрывятаў, Свіцязі, Лісна, Ельна, Лепельскага, Лукомльскага, Асвейскага і іншых чыстых крыніц і вадаёмаў з прэснай вадой. Яны таксама сяліліся каля лясоў, дзе жылі ў дастатку і адчувалі сябе ў бяспецы.

Шчодрыя лясы і пушчы, рэкі і азёры, раскошныя лугі і ўрадлівыя палеткі з'яўляліся галоўнымі крыніцамі рэсурсаў для беларусаў. Берагі рэк, азёр і крыніц сапраўды былі райскімі месцамі, надзвычай утульнымі і камфортнымі для жыцця. Рэкі не толькі давалі чыстую прэсную ваду і рыбу, але таксама з'яўляліся важнымі гандлёвымі шляхамі. Дзякуючы ім адбывалася шматузроўневае ўзаемадзеянне з блізкімі і далёкімі суседзямі.

Беларуская зямля мела выключныя перавагі дзякуючы геаграфічнаму размяшчэнню. Якраз па Менскім узвышшы праходзіў вялікі водападзел паміж Балтыйскім і Чорным морамі, што спрыяла развіццю шырокіх гандлёвых сувязей. З антычных часоў гандляры з Балтыйскага ўзбярэжжа і Скандынавіі, якія імкнуліся з іх таварамі ў прычарнаморскія і міжземнаморскія гарады, абіралі найбольш кароткі рачны маршрут па Нёмане і Дзвіне, а затым – па Дняпры. Гэты найбуйнейшы гандлёвы шлях атрымаў летапіснае найменне «з варагаў у грэкі».

Некалькі важных гандлёвых калідораў, або волакаў, старанна ўладкаваных і дагледжаных, знаходзіліся якраз на беларускай зямлі. Рэчкі Ісляч, Уса і Сула цяклі ад Святой гары, што на Меншчыне, і ўпадалі ў Нёман. Рэчка Пціч цякла на поўдзень у Прыпяць, а затым – у Дняпро. Якраз паміж імі быў наладжаны перакуль тавараў, кантроль над якім арганізоўваўся і ажыццяўляўся са Старога Менска.

Яшчэ некалькі рэчак ад Святой гары цяклі ў заходнім напрамку, упадаючы ў Нёман. Заходняя Бярэзіна злучала з ім сваю плынь з правага боку. Рэчка Уша спачатку ўпадала ў Вілію, а затым – у Нёман. У той жа час з паўднёвага боку ад Святой гары пачыналася Свіслач і накіроўвалася на паўднёвы ўсход, упадаючы ў Бярэзіну, а праз яе і ў Дняпро. Паміж імі продкі беларусаў гэтаксама наладзілі гандлёвыя волакі, якія праходзілі паблізу Банцараўшчыны, а пазней – Гарадка на Вячы і Заслаўя.

Важны гандлёвы калідор знаходзіўся паміж рэчкамі Іліяй, якая цячэ ў Вілію, а затым трапляе ў Нёман, і Гайнай, якая ўпадае ў Бярэзіну, а пасля разам з ёю ў Дняпро. Насельнікі Старога гарадзішча і Новага гарадзішча, якія размешчаны на захад ад сучаснага Лагойска, забяспечвалі перакуль тавараў з Іліі ў Гайну. Гэтыя старадаўнія гарадкі, відавочна, служылі бяспечным месцам адпачынку для замежных гасцей.

Невялікі гандлёвы калідор, па ўсім відаць, існаваў паміж вярхоўем Віліі і рэчкай Поняй, якая прама ўпадае ў Бярэзіну. Са старадаўніх мястэчак з характэрнымі назвамі Пагост і Ізбішча, верагодна, і ажыццяўляўся сухапутны перакуль тавараў.

Прадпрымальныя беларусы наладзілі яшчэ два буйныя волакі з Дзвіны ў Дняпро. Першы знаходзіўся непадалёк ад Оршы, паміж рэчкамі Аршыцай і Лучосай. А другі – каля Гнёздава, што на Смаленшчыне.

З антычных часоў продкі беларусаў выкарыстоўвалі гандлёвы калідор паміж ракой Россю, якая ўпадае ў Нёман з левага боку, і ракой Ясельдай – левым прытокам Прыпяці. Жыхары старадаўняга Ваўкавыска, які вырас на беразе Росі, арганізавалі і ажыццяўлялі перавал тавараў у адзін і другі бакі. Гарадок служыў бяспечным месцам адпачынку для гасцей.

Верагодна, існаваў таксама падобны перавал з ракі Шчары ў рэчкі Бобрык і Цну, якія ўпадалі ў Прыпяць з левага боку. Ганцавічы якраз маглі служыць крэпасцю, з якой гарантавалася бяспека сухапутнага гандлёвага шляху.

Археалагічныя знаходкі сведчаць аб тым, што нашы далёкія прашчуры стварылі магчымасць перапраўляць тавары з ракі Ясельды ў раку Нараў, якая ўпадала ў Заходні Буг, а затым у Віслу. Гэтаксама перакуль тавараў ажыццяўляўся наўпрост з вярхоўя Прыпяці ў Заходні Буг.

Прыкладна ў I ст. з'яўляецца адметнае беларускае слова, адбываецца актыўнае фарміраванне беларускіх народных гаворак і гальванізуюцца этнаўтваральныя працэсы. У даўнія часы з'явілася спрадвечнабеларуская лексіка, адметныя словы, якіх няма ў іншых славянскіх мовах, напрыклад: абрус, амаль, лазня, туляцца.

У беларускай мове ўзніклі спецыфічныя рысы, якія адрознівалі яе ад іншых славянскіх моў. Так, у ёй выкарыстоўваліся афрыкаты (злітныя гукі) – [дз', дз, дж] – дзень, гляджу. У шэрагу слоў пачалі ўжывацца прыстаўныя галосныя: ільняны, аржаны, іржавы, імгла. Пры вымаўленні слоў у беларускай мове назіраліся аканне і яканне, падоўжаныя і падвоеныя зычныя. Паступова складвалася ўласная стылістыка і граматыка, нараджалася адметная лексіка, афармляўся гукавы лад мовы, або фанетычная сістэма, якая эвалюцыянавала і развівалася.

Ад моманту ўзнікнення беларуская мова пачынае актыўна выяўляць стваральную творчую энергію, лучыць людзей. Адбываецца актыўнае фарміраванне нацыянальных кодаў, сэнсаў і сімвалаў, якія зближаюць і надзвычай трывала з'ядноўваюць народ у адзіную супольнасць, падкрэсліваючы блізкасць і роднаснасць.

Ужо ў антычныя часы з'явіліся неацэнныя творы нацыянальнай міфалогіі і фальклору: рарытэтныя замовы, плачы-галашэнні па памерлых, асобныя казкі, архаічныя паданні і легенды, сямейна-абрадавыя і каляндарна-абрадавыя спевы. Менавіта яны аказвалі моцнае ўздзеянне на светапогляднае і духоўнае адзінства грамадства.

Такім чынам, пачынае зараджацца беларускі этнас – сацыяльны феномен, які мае кагнітыўную прыроду, характарызуецца моўнай і культурнай адметнасцю, а таксама ўсведамленнем людзьмі тоеснасці і агульнасці, прыналежнасці да адзінай супольнасці.

Важнымі кропкамі ўзнікнення і станаўлення беларускай народнасці з'яўляліся старажытныя паселішчы: Тураў і Мазыр, Браслаў і Гародня, Гомель і Орша, Віцебск і Полацк, Менск і Заслаўе, Банцараўшчына і Свіслач.

Па ўсім відаць, у вельмі глыбокай старажытнасці продкі беларусаў цесна ўзаемадзейнічалі з фіна-ўгорскімі плямёнамі, праявы чаго адбіліся ў беларускай тапаніміцы. Прынамсі, некаторыя назвы беларускіх рэк і вадаёмаў маюць аналагі на тэрыторыях, дзе калісьці стала жылі фіна-ўгорскія плямёны. Верагодна, фіна-ўгорскае паходжанне маюць гідронімы Дзвіна і Свір.

Як дакладна вядома з летапісных крыніц, пазней беларусы працяглы час кантактавалі з лівамі, чуддзю і мерай. Вынікі гэтага ўзаемадзеяння гэтаксама знайшлі адлюстраванне ў нацыянальнай мове і культуры, у народным мастацтве.

Суседзямі беларусаў на поўдні і ўсходзе доўгі час з'яўляліся скіфы (VIII ст. да н.э.– IV ст.н.э.) – буйная культурна-гістарычная супольнасць, якая складалася з многіх этнасаў і плямёнаў еўрапеоіднай расы. Прарадзіма скіфаў – Азія, на што ўказваў яшчэ Герадот. Іхнія плямёны пачалі свой рух на захад з Мінусійскай упадзіны, дзе з даўніх часоў існавалі найбольш спрыяльныя кліматычныя ўмовы для жыцця і гаспадарчай дзейнасці.

На працягу стагоддзяў скіфы засялялі велізарныя стэпавыя і лесастэпавыя абшары, пачынаючы ад Алтая, Саян і Енісея. Яны гэтаксама займалі тэрыторыі ад Дона да Дуная і стварылі высокую цывілізацыю, для якой характэрны курганная культура, шэраг асаблівасцей халоднай зброі (напрыклад, кароткі меч «акінак» і невялікі лук з кароткімі стрэламі), а таксама вытанчаны звярыны стыль у мастацтве. Скіфы і іх пераемнікі сарматы, без сумневу, шчытна кантактавалі са славянамі, аказвалі значны ўплыў на іх лад жыцця і культуру.

Продкі беларусаў зазналі ўздзеянне готаў (II–VIII стст.) – германскага племені, якое прыйшло са Скандынаўскага паўвострава і заняло тэрыторыі ўздоўж Віслы і Паўночнага Прычарнамор'я. Яны мелі ўласнае рунічнае пісьменства, узоры якога захаваліся да нашага часу, на высокім узроўні валодалі вайсковым майстэрствам. Як вынік – у 410 г. кароль готаў Аларых I (каля 370–410) разбурыў Рым. У працяглых гоцка-рымскіх войнах бралі ўдзел ваяры са славянскіх і ўласна беларускіх зямель. Іх атрадамі масава

папаўнялася войска гоцкага караля Тэадорыха (каля 451–526). Менавіта ад готаў у славянскія мовы патрапілі словы «хлеб», «кацёл», «купіць».

У II–V стст. усходнеславянскія народы сутыкнуліся з гунамі – супольнасцю плямёнаў, якія прыйшлі са стэпаў Усходняй Еўропы. Найвялікшай магутнасці яны дасягнулі ў часы Атылы (434–453), які разграміў армію бургундаў на Рэйне ў 435 г., а пасля кінуў выклік магутнай Рымскай імперыі. Славянскія атрады актыўна ўдзельнічалі ў гунскім войску, якое пагражала Канстанцінопалю. Шэраг славянскіх плямёнаў уваходзілі ў склад дзяржавы Атылы. Гуны паспрыялі вызваленню славян ад германа-гоцкага панавання і скіфа-іранскіх уплываў. У сваю чаргу ад продкаў беларусаў яны перанялі звычай спраўляць трызну («страву») на магілах памерлых, аб чым паведамляў старажытны гісторык Іардан.

Такім чынам, беларуская народнасць фармавалася з антычных часоў як адна з буйных усходнеславянскіх этнакультурных груп. Яна зазнала ўздзеянне фіна-ўграў, скіфаў, готаў і гунаў, а затым сінтэзавала субкультуры іншых славянскіх плямёнаў. У антрапалогіі, мове і культуры беларусаў пераважалі індаеўрапейскія карані і агульнаславянскія элементы.

Актыўнае станаўленне беларускага этнасу пачалося прыкладна з I ст. У вуснай мове даволі выразна акрэсліліся ўласна беларускія рысы, на ёй пачалі ажыццяўляцца інтэнсіўная камунікацыя і творчыя інтэнцыі. У глыбокай старажытнасці нарадзіліся яркія шэдэўры вусна-паэтычнай творчасці. Асобныя з іх з'яўляюцца арганічнай часткай пракаветных абрадаў, рытуалаў і культаў.

Менавіта адметная беларуская мова, фальклор і традыцыйныя святы істотна паўплывалі на менталітэт грамадства, прадвызначылі яго духоўна-культурнае жыццё, сталі стрыжнем беларускай народнасці.

**СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ**

1. Акунов В.В. Готы.– М., 2018.
2. Алексеев В.П. Становление человечества.– М., 1984.
3. Алексеев В.П., Першиц А.И. История первобытного общества.– 4-е изд.– М., 1990.
4. Бирнбаум Х. Праславянский язык. Достижения и проблемы его реконструкции, пер. с англ.– М., 1987.
5. Бурлак С.А., Старостин С.А. Сравнительно-историческое языкознание.– М., 2005.
6. Выгонная Л.Ц. Фанетыка роднага слова: выбраныя працы / Л.Ц. Выгонная; уклад.: В.П. Русак [і інш.].– Мінск, 2023.
7. Геродот. История в 9 кн.: в 2 т. / пер., предисл. и указатель Ф.Г. Мищенко.– Изд. 2-е, испр., доб. в предисл. и снабженное картами.– М., 1888.
8. Геродотова Скифия: историко-географический анализ / отв. ред. Д.Б. Шелов.– М., 1979.
9. Гильфердинг А.Ф. О сродстве языка славянского с санскритским.– СПб., 1853.
10. Гринин Л.Е. Производительные силы и исторический процесс.– 3-е изд., стер.– М., 2006.
11. Гурина Н.Н. Древняя история Северо-Запада Европейской части СССР / Н.Н. Гурина.– М.; Л., 1961.
12. Иванов В.В. Славянские языковые моделирующие семиотические системы (древний период) / В.В. Иванов, В.Н. Топоров.– М., 1965.
13. Иванов В.В., Гамкрелидзе Т.В. Индоевропейский язык и индоевропейцы. Реконструкция и историко-типологический анализ праязыка и протокультуры (в 2 т.).– Тбилиси, 1984.
14. Иордан. О происхождении и деяниях гетов: Getica / Иордан.– М., 1960.
15. Крапивнер Р.Б. Кризис ледниковой теории: аргументы и факты.– М., 2018.
16. Ловмянский Г. Религия славян и ее упадок.– СПб., 2003.
17. Макушников О.А. Колочинская культура в Гомельском Поднепровье и сменяющие ее памятники VIII–IX вв. // Краткие сообщения Института археологии. 2014. №235. С. 363–380.
18. Митрофанов А.Г. Банцеровское городище / А. Г. Митрофанов // Белорусские древности. Докл. к конф. по археологии Беларуси (янв.– фев. 1968).– Минск, 1968. С. 243–261.
19. Мызников С.А. Лексика финно-угорского происхождения в русских говорах Северо-Запада: Этимологический и лингвогеографический анализ.– СПб., 2004.
20. Норман Б.Ю. Теория языка. Вводный курс. 3-е изд.– М., 2009.
21. Пропп В.Я. Исторические корни волшебной сказки.– Л., 1946, 1986.
22. Робертс Эллис. Происхождение человека. Эволюция / пер. с англ. И.В. Павловой, О.В. Сергеевой.– М., 2014.
23. Седов В.В. Восточные славяне в VI–XIII вв. / В.В. Седов; отв. ред. тома Б.А. Рыбаков.– М., 1982.
24. Седов В.В. Происхождение и ранняя история славян / В.В. Седов.– М., 1979.
25. Симокатта Ф. История / Феофилакт Симокатта / Акад. наук. СССР, Ин-т истории, Ин-т славяноведения; отв. ред. Н.В. Пигулевская; вступ. ст. Н.В. Пигулевской; пер. С.П. Кондратьева; примеч. К. А. Осиповой.– М., 1957.
26. Толстой Н.И. Очерки славянского язычества.– М., 2003. Традиционная духовная культура славян / Современные исследования.
27. Традыцыйны светагляд беларусаў. У 5 кн. Кн. 1. Касмалогія. Народная тэалогія / уклад. і агул. рэд.: І.М. Дубянецкая, С.І. Санько.– Мінск, 2023.
28. Традыцыйны светагляд беларусаў. У 5 кн. Кн. 2. Сфера сакральнага. Народная тэалогія / уклад. і агул. рэд.: І.М. Дубянецкая, С.І. Санько.– Мінск, 2023.
29. Традыцыйны светагляд беларусаў. У 5 кн. Кн. 4. Грамадства / уклад. і агул. рэд.: І.М. Дубянецкая, С.І. Санько.– Мінск, 2025.
30. Трубачев О.Н. Этногенез и культура древнейших славян.– 2-е изд.– М., 2003.
31. Массон В.М. Возникновение и развитие земледелия / АН СССР. ИА.– М., 1967.
32. Мейе А. Общеславянский язык / пер. с франц.– М., 1951.
33. Мейе А. Введение в сравнительное изучение индоевропейских языков. 4-е изд.– М., 2007.
34. Уайт Эдмунд, Браун Дейл М. Первые люди / пер. с англ. И.Г. Гуровой.– М., 1978.
35. Филин Ф.П. Происхождение русского, украинского и белорусского языков: Историко-диалектологический очерк.– Л., 1972.
36. Штыхов Г.В. Об этнической интерпретации банцеровской культуры / Г.В. Штыхов // Насельніцтва Беларусі і сумежных тэрыторый у эпоху жалеза.– Мінск, 1992.
37. Этнаграфія беларусаў: гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя / рэдкал.: В.К. Бандарчык, В.І. Мялешка, М.Ф. Піліпенка.– Мінск, 1985.
38. Этнография восточных славян: очерки традиционной культуры / отв. ред. К.В. Чистов.– М., 1987.
39. Этнология: учеб. для высших учеб. заведений / под ред. Г.Е. Маркова и В.В. Пименова.– М., 1994.
40. Beekes R.S. P. Comparative Indo-European linguistics.– Amsterdam; Philadelphia, 1995.
41. Fitch W. Tecumseh. The Evolution of Language.– New York, 2010.